Г.С.Мішуроў, *прафесар*

# ЗНАЧЭННЕ РЭПЕРТУАРУ ВА ЎДАСКАНАЛЕННІ ВЫКАНАННЯ (на прыкладзе вучэбнага ансамбля «Беларускія ўзоры» БДУ культуры)

Функцыянаванне вучэбных традыцыйных ансамбляў і іх роля ў падрыхтоўцы кіраўнікоў калектываў народнай музыкі амаль не асвятляліся ў літаратуры, за выключэннем некалькіх прац. Мы маем на ўвазе кнігі "Мастацкая творчасць" М.Кузьмініча, "Народная інструментальная культура Паазер'я" А.Скарабагатчанка, "Работа ў класе ансамбля" В.Зяленіна, "Асновы ансамблевай тэхнікі" А.Готліба, "Квартэтнае мастацтва" Р.Давідзян.

У дадзеным артыкуле звернем увагу на ролю студэнцкай навукова-творчай лабараторыі народна-інструментальнага ансамбля «Беларускія ўзоры» ў выхаванні маладых музыкантаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Перш за ўсё мы маем на ўвазе музычна-выканальніцкую, тэмбрава-акустычную і іншыя формы выканання, якія ўдасканальваюцца пры адпаведным падборы рэпертуару для ансамбля.

Ансамблевае музіцыраванне на народных інструментах мае некаторыя спецыфічныя рысы, што адрознівае яго як ад сольнага выканання, так і ад ігры ў аркестры. Яно ў значнай ступені нават супрацьстаіць ім, таму што і сольнае, і аркестравае выкананне — гэта творчасць адной асобы (выканаўцы або дырыжора). Ігра ў камерных і іншых змяшаных ансамблях пабудавана на зусім іншым прынцыпе — узаемным супадпарадкаванні розных індывідуальнасцей. Такое спалучэнне агульных музычна-выканальніцкіх задач са своеасаблівым іх праламленнем у канкрэтнай практыцы прад'яўляе вялікія патрабаванні і да выкладчыка, і да студэнтаў.

Заняткі ў ансамблі садзейнічаюць удасканаленню выканальніцкага майстэрства яго ўдзельнікаў, прыносяць ім маральнае і эстэтычнае задавальненне ад дачынення да свету мастацтва. Калектыўнасць творчасці, неабходнасць узаемаразумення ствараюць у ансамблі асаблівую абстаноўку сяброўства. К.С.Станіслаўскі падкрэсліваў: "Вы залежыце ад вашых таварышаў так, як і яны залежаць ад вас. Калектыўнае мастацтва стварaецца толькі ў атмасферы садружнасці і ўзаемнай дапамогі". Неабходна адзначыць асаблівую ролю ансамблевага жанру ў комплексным выхаванні яго ўдзельнікаў, у фарміраванні ў іх музычнага мыслення, эстэтычнага густу, характару, маральнасці і ў цэлым асобы.

Ансамбль "Беларускія ўзоры" ўключае наступныя інструменты: дзве скрыпкі, двое цымбалаў, флейту, віяланчэль, тры баяны, гармоніку, смычковы кантрабас, шумавыя і ўдарныя інструменты. Усе пералічаныя беларускія інструменты звычайна ўваходзяць у склад розных відаў малакалькасных ансамбляў. Ансамбль народных інструментаў "Беларускія ўзоры" належыць

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

да павялічанага складу троістай музыкі. Павелічэнне колькасці інструментаў у ансамблі прывяло да значнага ўзмацнення гучання, выразнасці выконваемай народнай музыкі і балансіроўкі галасоў партытуры. Пры такім складзе троістай музыкі, г.зн. вялікай музыкі, як гавораць у народзе, трэба дакладна ўлічваць музычна-выканальніцкія тэмбры. Таму ў падобным складзе вялікае значэнне маюць тэмбравыя суадносіны паміж народнымі інструментамі ансамбля. Мы стварылі такі склад ансамбля, дзе гучанне ўсіх інструментаў роўнае, прыемнае, мяккае, рэзка не вылучаюцца тыя або іншыя інструменты ў агульным гучанні партытуры. Уявім сабе адначасовае трэмала на домры і балалайцы. У такім спалучэнні некалькі больш "жорсткі" тэмбр домры амаль выцісне з успрымання слухача тэмбр балалайкі. У якасці прыкладу спалучэння можна прапанаваць баян і віяланчэль; цымбалы, скрыпку і баян; цымбалы і флейту. Такое тэмбравае аб'яднанне інструментаў трэба ўлічваць пры аранжыроўцы твора для народна-інструментальнага ансамбля.

Асабліва важна звярнуць увагу на спалучэнне скрыпкі і дуды, у значнай ступені заснаванае на прынцыпах гетэрафаніі. Больш развітым у стылістычных адносінах уяўляецца выкананне струннага трыо ў ансамблі, які складаецца з дзвюх скрыпак і віяланчэлі або кантрабаса для стварэння рытміка-гарманічнага фону.

Прынцыпова важна, што паказаны склад ансамбля ўпершыню створаны ў Беларусі з арыентацыяй на пэўны рэпертуар, які адпавядае менавіта такому ансамблю ў музычных і тэмбрава-акустычных адносінах. Кожны твор мае да таго ж свой, непаўторны каларыт гучання, уласцівы толькі яму свет тэмбравых фарбаў.

Фарміруючы рэпертуар для ансамбля, мы імкнемся да таго, каб кожны новы твор садзейнічаў далейшаму росту ансамбля і ўяўляў сабою новую ступень у павышэнні музычнага ўзроўню

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

калектыву, развіцці тэхнічных і музычна-слыхавых навыкаў выканаўцаў.

Мэта работы калектыву над музычным творам — выкананне яго ў канцэрце, таму ў рэпертуар уключаюцца творы з улікам магчымасці выкарыстання іх у тых ці іншых канцэртных выступленнях. Адначасова ў рэпертуар уключаюцца п'есы, што служаць вырашэнню пэўных вучэбных задач. У якасці вучэбнага рэпертуару, прызначанага для выхавання навыкаў ансамблевага выканання, выкарыстоўваюцца практыкаванні і п'есы, правераныя ў педагагічнай практыцы і рэкамендаваныя ў метадычнай літаратуры. Па меры ўдасканалення выканальніцкіх навыкаў у ўдзельнікаў інструментальнага ансамбля вучэбны рэпертуар усё больш замяняецца канцэртным. Тыя або іншыя вучэбныя задачы вырашаюцца ў працэсе работы ансамбля над канцэртнымі творамі.

Бывае, што выканаўцы ансамбля прапануюць уключыць у рэпертуар цікавыя для іх творы. Гэтыя прапановы ўлічваюцца, але заўсёды неабходна памятаць, што рэпертуар павінен быць дзейсным сродкам выхавання сапраўднага музычнага густу.

Пры ўсёй разнастайнасці рэпертуару, даступнага для выканання на народных інструментах, аснову яго, натуральна, складаюць народная музыка, апрацоўкі народных песень і танцаў. Аднак толькі гэтым пластом музычнай культуры нельга абмяжоўвацца, і, акрамя народнай музыкі, рэпертуар павінен уключаць рускую і замежную класіку, апрацоўкі песень і танцаў народаў СНД, народаў іншых краін.

У рэпертуар уключаюцца п'есы, якія, у першую чаргу, дапамагаюць навучэнцам авалодаць ведамі і навыкамі, што не заўсёды маюцца ў ансамблевым майстэрстве. Адначасова трэба працаваць і над творамі, якія дазваляюць замацоўваць набытае ў працэсе сумеснага музіцыравання. Па магчымасці неабходна працаваць над творамі, здольнымі захапіць удзельнікаў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ансамбля і не выклікаць у каго-небудзь з іх актыўнага ўнутранага пратэсту. На жаль, арыгінальных твораў для такога складу анасамбля, як "Беларускія ўзоры", у патрабуемай аранжыроўцы няма.

Заняткі ў ансамблі садзейнічаюць развіццю шэрага якасцей, неабходных любому музыканту, гэта адчуванне рытму і тэмпу, дысцыплінаванасць, уважлівасць, слых і інш. Калектыўная ігра патрабуе ад студэнта чуць не толькі сваю партыю, але і партыі іншых удзельнікаў. Больш таго, неабходна не проста чуць, але і ў адпаведных выпадках карэкціраваць сваё выкананне з улікам агульнай гукавой карціны, таму што ігра ў ансамблі — гэта творчы кантакт з партнёрамі, заснаваны на гранічна слыхавой актыўнасці. Заняткі з'яўляюцца незаменным сродкам выхавання ўмення слухаць. Партытурнасць тэксту ансамблевых твораў патрабуе азнаямлення кожнага ўдзельніка з партытурай як для атрымання цэласнага ўяўлення ад твора, так і для ўсведамлення свайго ўкладу ў гэтае цэлае. Мы часта выкарыстоўваем такі прыём: адзін з удзельнікаў сочыць па нотах за выкананнем іншых і імкнецца знаходзіць у ім недакладнасці. Гэты прыём вельмі дапамагае ўласнаму музычнаму развіццю і наогул навучанню маладых музыкантаў. Магнітафонны запіс, а затым праслухоўванне з партытурай свайго выканання ўсімі ўдзельнікамі ансамбля пад кіраўніцтвам і назіраннем педагога актывізуюць работу і слыхавую накіраванасць кожнага ўдзельніка. Праслухоўванне запісаў тых або іншых твораў, напісаных слыннымі музыкантамі, параўнанне розных інтэрпрэтацый з'яўляюцца выдатнай школай выхавання густу, пачуцця стылю, слыху, фантазіі, свядомых адносін да выканальніцкіх задач.

Працэс удасканалення ансамблевага выканання ўключае не толькі ўсе фазы папярэдняй самастойнай работы, але і праверку яе вынікаў, якія адначасова служаць канчатковай мэтай сумеснага музіцыравання. Пры гэтым маецца на ўвазе не толькі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

канцэртная эстрада, але і абавязковыя для ўсіх навучэнцаў паказы сваіх дасягненняў перад камісіяй на экзаменах і заліках. Псіхалагічныя нюансы паміж названымі дзвюма формамі выступленняў, безумоўна, існуюць, аднак агульных рыс і задач больш. Перш за ўсё гэта максімальная мабілізацыя ўвагі, канцэнтрацыя творчых сіл пры выкананні твора, выяўленне ўсяго назапашанага ў папярэдняй рабоце.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ